А. Г. КАХАНОЎСКІ

# САСЛОЎНАЯ І САЦЫЯЛЬНА-ПРАФЕСІЙНАЯ СТРАТЫФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА Ў 60—90-х гг. XIX ст.

Для аналізу сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства ў 60—90-х гг. XIX ст. актуальнай будзе характарыстыка саслоўнай і сацыяльна-прафесійнай стратыфікацыйных сістэм на фоне пераходу ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага.

Тэрмін «сацыяльная стратыфікацыя» да 1990-х гг. практычна не выкарыстоўваўся беларускімі гісторыкамі, але асобныя аспекты навуковай праблемы, якая акрэсліваецца дэфініцыяй узгаданага тэрміна, знайшлі пэўнае асвятленне ў працах па сацыяльна-эканамічнай, палітычнай гісторыі Беларусі. Сацыяльная стратыфікацыя — ранжыраванне сацыяльных груп і індывідаў у залежнасці ад размеркавання ўлады, уласнасці і прэстыжу, мае на ўвазе, што пэўныя сацыяльныя адрозненні паміж людзьмі набываюць характар іерархічнага ранжыравання.

У 60—90-х гг. XIX ст. склад насельніцтва Беларусі ўяўляў сабой складанае пераплячэнне элементаў, характэрных для сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства і элементаў саслоўнай іерархіі мінулай эпохі. На працэс буржуазнай эвалюцыі сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі, які да канца XIX ст. не завяршыўся, стагніруючае ўздзеянне аказвала ўрадавая палітыка, асабліва абмежавальныя законы ў дачыненні яўрэяў, католікаў, замежных грамадзян і сялянства. У той жа час змены ў сацыяльна-эканамічным абліччы Беларусі — таварызацыя сельскай гаспадаркі, развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці і г. д. — прычыніліся да адпаведных перамен ў складзе грамадства — фарміравання сацыяльных груп індустрыяльнага грамадства, інтэнсіфікацыі урбанізацыйных працэсаў і г. д.

Саслоўны склад жыхароў Беларусі напярэдадні рэформы 1861 г. выглядаў наступным чынам: дваране (спадчынныя і асабістыя) складалі 5,1 % (220 973 чалавекі) насельніцтва пяці беларускіх губерняў, хрысціянскія святары — 0,6 % (27 717), пачэсныя грамадзяне — 0, 012 % (550), купцы — 0,4 % (16 699), мяшчане — 12,3 % (542 966), цэхавыя — 0,9 % (38 434), сяляне — 77 % (3 397 377), ваенныя саслоўі (за выключэннем рэгулярных войскаў) — 1,6 % (72 209 чалавек) [16, *267—293*].

У другой палове XIX ст. саслоўныя перагародкі захаваліся. Гэтаму спрыяла ўрадавая палітыка, а таксама традыцыйнасць грамадскай свядомасці людзей. Аднак пад уплывам развіцця буржуазных адносін, мадэрнізацыйных працэсаў адбылася некаторая нівеліроўка саслоўных межаў. Фармальнымі яны станавіліся ў першую чаргу ў эканамічных адносінах. Утвараліся новыя сацыяльна-прафесійныя групы,

якія ўключалі прадстаўнікоў розных саслоўяў. Сімптаматычным пацвярджэннем адзначанага працэсу стаў, да прыкладу, закон 1898 г., які зацвярджаў Палажэнне аб дзяржаўным прамысловым падатку, паводле якога станавілася неабавязковым для тых, хто займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю, запісвацца ў купецкае саслоўе. Тым не менш, у сацыяльна-палітычных, прававых адносінах саслоўны падзел грамадства працягваў функцыянаваць, хаця многія з дэклараваных прывілеяў саслоўяў страцілі свой практычны сэнс.

Паводле матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г., саслоўны склад жыхароў пяці беларускіх губерняў выглядаў наступным чынам: дваранства складала 2,4 % (241 тыс. чал.) насельніцтва, духавенства — 0,3 % (21,9 тыс. чалавек), пачэсныя грамадзяне — 0,2 % (каля 14 тыс.), купцы — 0,22 % (18,3 тыс.), мяшчане — 20,9 % (1,78 млн), сяляне — 75,3 % (6,42 млн чалавек). Удзельная вага розных саслоўных груп за 60—90-я гг. XIX ст. змянілася нязначна, можна заўважыць толькі тэндэнцыю росту гарадскіх катэгорый насельніцтва [9, вып. IV, V, тетрадь I, табл. VI; вып. XI, XXII, XXIII, табл. VIII].

Адпаведна заканадаўству Расійскай імперыі дваране ў залежнасці ад іх паходжання, заслуг і пасады на вайсковай ці грамадзянскай службе падзяляліся на спадчынных (дваранскі тытул якіх перадаваўся з пакалення ў пакаленне) і асабістых (пажыццёвае дваранства). Спадчыннае дваранства падзялялася на шэсць разрадаў: нададзенае; вайсковае; дваранства, атрыманае ў выніку выслугі пэўнага чыну на грамадзянскай службе ці ўзнагароджання ордэнам; замежныя дваранскія роды; тытуляванае дваранства; старажытныя шляхецкія роды. Першыя тры разрады складалі роды, якія атрымлівалі дваранства дзякуючы якім-небудзь заслугам (асноўная крыніца папаўнення родаў дваранства ў Расійскай імперыі). Сярод 1371 дваранскага рода Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст. налічвалася 273 фаміліі (19,9 %) нададзенага дваранства, 170 фамілій (12,4 %), якія набылі тытул у выніку адзнакі на вайсковай службе, 270 (19,7 %) — якія атрымалі дваранства за заслугі на грамадзянскай службе ці праз узнагароджанне ордэнам, 3 (0,2 %) — замежныя роды, 14 (1 %) — тытуляванае дваранства, 691 (46,8 %) — старажытныя роды [3, *32—33*].

За чатыры пярэформенныя дзесяцігоддзі амаль на 150 % павялічылася ў беларускіх губернях колькасць асабістага дваранства і класных чыноўнікаў — з 22,6 тыс. у 1863 г. да 36 тыс. у 1897 г. [3, *300—301*]. Гэта была крыніца папаўнення шэрагаў спадчыннай часткі вышэйшага саслоўя. Пасля паўстання 1863 г. асобам каталіцкага веравызнання было вельмі цяжка трапіць на дзяржаўную службу, каб мець магчымасць праз пэўную выслугу атрымаць асабістае дваранства. У сувязі з гэтым інстытут асабістага дваранства выкарыстоўваўся ў Беларусі для ўзмацнення пазіцый рускага элемента ў вышэйшым саслоўі за кошт прызыву на службу прысланых з унутраных губерняў Расіі чыноўнікаў і вайскоўцаў.

Да пачатку 60-х гг. XIX ст. 14 % спадчынных дваран Беларусі мела зямельныя ўладанні і прыгонных сялян. Астатнія 86 % складала дваранства, якое фігуравала ва ўрадавых дакументах таго часу як шляхта. Да яе адносіліся тыя, хто не валодаў зямельнай уласнасцю ці меў зямлю, не населеную сялянамі [17, *200*]. Сродкі для свайго існавання шляхта часта вымушана была здабываць арэндай зямлі, прадпрыемстваў у памешчыкаў, службай, працай па найме. Па эканамічным становішчы беззямельная і малазямельная (да 20 дзес.) яе частка істотна не адрознівалася ад асноўнай масы сельскага насельніцтва. Характарызуючы дробнае дваранства Гродзенскай губерні, афіцэр Генеральнага штаба П. Баброўскі пісаў, што яно расселена «па гара-

дах, мястэчках і сёлах. Некаторыя трымаюць у арэндзе фермы, памешчыцкія маёнткі і розныя чыншавыя; іншыя служаць у памешчыкаў, займаючы пасады эканомаў, кіраўнікоў, канторшчыкаў, пісараў і г. д.; нарэшце, трэція, і, бадай што, гэта ці не найбольшая колькасць дваран займаецца сельскай гаспадаркай, утвараючы цэлыя дваранскія аколіцы, і сваім бытам і спосабам жыцця стаяць на адной прыступцы з сялянамі» [5, ч. 1, *731*]. Аднак сацыяльныя ўстаноўкі, арыентацыя, псіхалагічны бар'ер у стасунках з навакольным вясковым насельніцтвам, звязаныя з асэнсаваннем сваёй прыналежнасці да вышэйшага саслоўя, перашкаджалі размыванню шляхты сярод іншых катэгорый жыхароў. З гэтай нагоды магілёўскі губернатар А. Дэмбавецкі адзначаў: «У характары шляхціца адметныя рысы: запал і выхвальства ў адносінах да роўных, уніжэнне і рабалепства перад вышэйшымі. Запал і выхвальства выяўляюцца ў шляхты не толькі перад сялянамі, але і адзін перад другім, што часта даводзіла шляхту да судовых разбораў» [2, кн. 1, *602*].

Высокая сацыяльная актыўнасць шляхты, схільнасць яе да ідэй нацыянальна-вызваленчага руху, шырокі ўдзел у паўстаннях 1830—1831 і 1863 гг. былі прадметам пастаянных турбот урада. У сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. ён ускладніў правілы пацвярджэння шляхтай сваёй прыналежнасці да вышэйшага саслоўя, паскорыў разгляд спраў па гэтых пытаннях, а таксама прыпіску тых шляхціцаў, хто не пацвердзіў сваіх правоў да падатковых катэгорый насельніцтва. Гэта ўрадавая мера закранула ў адной толькі Мінскай губерні звыш 30 тыс. чалавек вакольнічнай і чыншавай шляхты [10, *845*].

Адной з важных характарыстык дваранства як сацыяльнай групы з'яўляецца яго нацыянальны склад. Пасля паўстання 1863 г. нацыянальна-канфесійная прыналежнасць адыгрывала значную ролю ў вызначэнні сацыяльнай іерархіі ўнутры вышэйшага саслоўя ў Беларусі: рускія займалі, безумоўна, больш высокую страту, абмежаванні ў дачыненні католікаў і палякаў прывялі да прыніжэння іх становішча ўнутры вышэйшага саслоўя. Сярод 149 168 спадчынных дваран (звесткі падлічаны па 35 беларускіх паветах) 77 264 дваран (51,8 %) прызнавалі роднай мовай беларускую, 17 486 (11,7 %) — рускую, 49 024 (32,9 %) — польскую. Большасць асоб, якія мелі асабістае дваранства, складалі рускія — 50,8 % (12 726 чалавек), 25,6 % (6487) былі беларусамі, 18,7 % (4685) — палякамі. Прычынай істотнай розніцы па нацыянальным складзе паміж спадчынным і асабістым дваранствам была нацыянальная палітыка ўрада, калі пры прыёме на дзяржаўную службу — асноўны шлях набыцця асабістага дваранства — у Беларусі надавалі перавагу прыезджым чыноўнікам, а для мясцовых, асабліва каталіцкага веравызнання, існавалі істотныя абмежаванні. Дарэчы, гэтыя меры прывялі да значнага сацыяльнага раз'яднання дваранскага саслоўя: «...палякі трымаюцца асобна і не сыходзяцца з рускімі дваранамі. Прычынай гэтага з'яўляецца, з аднаго боку, адсутнасць дваранскіх сходаў... а з другога боку, розніца павялічваецца праз абмежаванне правоў палякаў, якім забаронены доступ на службу»[12, ч. 3, *9*].

Сацыяльна-эканамічны воблік паместнага дваранства вызначалі памеры і структура зямельнай уласнасці і сістэма вядзення гаспадаркі. Паводле матэрыялаў пазямельнага абследавання 1877—1878 гг., у Беларусі налічвалася 7984 памешчыкі, з іх 7284 дваран (91,2 %) [14, *10—15, 54—62, 88, 95, 116—117, 121—1225, 152, 159*]. У гэты час вышэйшаму саслоўю належала 8,24 млн дзес. зямлі, што складала 94,1 % агульнай плошчы памешчыцкага землеўладання. Дваране-памешчыкі з уласнасцю звыш

500 дзес. (каля 35 % памеснага дваранства) валодалі звыш чым 89 % дваранскага зямельнага фонду, у тым ліку найбольш значныя аграрыі, з уласнасцю звыш 2 тыс дзес. (10,9 % памеснага дваранства), валодалі 68,2 % (5,6 млн дзес.) гэтага фонду. У Беларусі налічвалася 14 буйных магнацкіх сямействаў, ва ўласнасці якіх 70—80-х гг. знаходзілася чвэрць агульнай плошчы памешчыцкай зямлі [8, *70*].

Духавенства Беларусі ў другой палове XIX ст. было прадстаўлена пераважна праваслаўным, каталіцкім і іудзейскім. Астатнія яго групы — евангелісцка-лютэранскае, евангелісцка-рэфармацкае, мусульманскае — былі нешматлікімі. У 1866 г. у Беларусі налічвалася 18 593 прадстаўнікі праваслаўнага святарства, 679 — каталіцкага, 1 713 — іудзейскага, 89 — адзінаверніцкага, 55 — мусульманскага, 47 — евангеліцка-рэфармацкага, 15 — евангеліцка-лютэранскага, а ўсяго — 21 193 чалавекі [7, *185—187, 194, 195, 202, 206, 207, 210, 225*]. Паводле дадзеных перапісу насельніцтва 1897 г. на Беларусі налічвалася 6198 святароў (без уліку членаў сямей), з іх — 4830 праваслаўных (87,9 %), каталіцкіх і пратэстанцкіх — 466 (7,5 %), іудзейскага і мусульманскага — 902 (14,6 %) [9, вып. IV, V, XI, XXII, XXIII, табл. XXI]. Найбольш шматлікае праваслаўнае духавенства было прадстаўлена белым (прыходскія святары) і чорным (манахі). Сярод белага і чорнага духавенства існавала службовая іерархія: да прыкладу, у белага — знізу уверх — протадзіякан, іерэй, протаіерэй і г. д. У 1880 г. у Мінскай губерні было 32 благачынныя святары, 23 протаіерэі, 563 святары, 41 дзіякан, 566 псаломшчыкаў [15, I—X]. Вышэйшы слой святароў Беларусі складалі епіскапы, рэктары духоўных семінарый, ігумены манастыроў і інш. Да выдання закону, 26 мая 1869 г, які адмяніў спадчыннасць і замкнёнасць духавенства, кантынгент царкоўнага кліра імкнуліся рэкрутаваць з свайго асяроддзя. З гэтага моманту ў складзе святароў павялічывалася ўдзельная вага выхадцаў з падатных саслоўяў. Сярод святароў назіраўся найбольш высокі працэнт пісьменных. У 1897 г. у Магілёўскай епархіі з 18 протаіерэяў усе закончылі курс багаслоўскіх навук у духоўнай акадэміі ці семінарыі; з 477 святароў — 438 мелі завершаную багаслоўскую адукацыю, 18 філасофскую і г. д. [11, *1—2, 10—11*].

Каталіцкія святары Беларусі займалі больш нізкае сацыяльнае становішча чым праваслаўныя, у сувязі з абмежавальнымі мерапрыемствамі ў дачыненні каталіцкай царквы пасля паўстання 1863 г. Каталіцкае духавенства таксама падзялялася на белае і чорнае, у яго асяроддзі існавала развітая сацыяльна-службовая іерархія. Праваслаўныя і каталіцкія святары атрымлівалі дзяржаўнае ўтрыманне, але параўнальна значна меншае, чым чыноўнікі.

Яўрэйскія святары — равіны — карысталіся саслоўнымі правамі купецтва першай гільдыі, аднак гандлёва-прамысловай дзейнацю займаліся на агульнай падставе.

Гарадское насельніцтва падзялялася на некалькі саслоўных груп, якія адрозніваліся паміж сабой правамі, прафесійнай дзейнасцю і даходамі. Пачэсныя грамадзяне ўяўлялі сабой вышэйшае гарадское саслоўе. Яны падзяляліся на спадчынных і асабістых. Спадчыннае пачэснае грамадзянства атрымлівалі ад нараджэння дзеці асабістых дваран, праваслаўных святароў, калі апошнія мелі пэўныя багаслоўскія вучоныя ступені па заканчэнні духоўнай акадэміі ці семінарыі, і г. д. Да гэтага саслоўя прыпісваліся купцы першай і другой гільдыі пасля адпаведна 10 і 20 год знаходжання ў гільдзействе ці па атрыманню ордэна; камерц- і мануфактурсаветнікі; асобы, якія закончылі універсітэт з вучонай ступенню магістра ці доктара; чыноўнікі з XIV па IX клас і інш. Прадстаўнікі гэтага саслоўя займаліся прамысловым, гандлёвым

прадпрымальніцтвам, «вольнымі» прафесіямі і г. д. Заканадаўча афармленыя іх прывілеі ў 1860—1890-я гг. паступова страцілі сваё рэальнае значэнне.

Да канца XIX ст. гандлёвае прадпрымальніцтва ў адносна буйных памерах заканадаўча звязвалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. Акрамя таго, прадстаўнікам купецтва Беларусі належала каля 30 % фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў і мануфактур. У выніку рэформ 1860-х гг. гэтае саслоўе страціла многія перавагі, найперш пры ўплаце гандлёвых збораў, яно стала менш прыцягальным для мяшчан, сялян і інш. [4, т. 1, *116*]. Адбывалася памяншэнне ўдзельнай вагі гільдзейскага купецтва, адначасова расло колькасна і па сваёй эканамічнай сіле мяшчанскае саслоўе. Пэўны ўплыў на ўнутрысаслоўную мабільнасць гарадскіх груп жыхароў у другой палове XIX ст. аказала сялянства. Аднак у Беларусі гэты працэс праявіў сябе менш адчувальна па прычынах спецыфікі нацыянальнага складу гараджан і ў гэтай сувязі істотнай раз'яднанасцю сацыяльных працэсаў у горадзе і вёсцы Беларусі.

Мяшчанства колькасна папаўнялася за кошт купцоў, якія бяднелі ці страчвалі сэнс у набыцці гільдзейскіх дакументаў, цэхавых, калі яны змянялі прафесійную дзейнасць, сялян, якія мігрыравалі ў горад. Мяшчане набывалі пасведчанне на права займацца гандлем і промысламі. У канцы XIX ст. каля 17 % фабрык і заводаў Беларусі належала мяшчанам, аднак пераважна гэта былі невялікія прадпрыемствы [13]. Катэгорыю «цэхавых» складала карпаратыўная частка гарадскіх рамеснікаў, аднак удзельная вага іх к канцу XIX ст. змяншаецца, асабліва пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў.

Сярод ваенных саслоўяў, акрамя рэгулярных войскаў, асобна ўлічвалася колькасць бестэрмінова адпушчаных, адстаўных ніжэйшых вайсковых чыноў, дзяцей і жонак салдат і кантаністаў. Асноўная маса іх жыла ў сельскай мясцовасці, займалася земляробствам, промысламі ці атрымлівалі пенсію, знаходзіліся на ўтрыманні [6, ф. 21, воп. 1, спр. 10, а. *3, 6, 16, 17, 24, 25, 30—33, 37*].

Беларусь у 60—90-х гг. XIX ст. заставалася аграрным рэгіёнам. Рэформа 1861 г. змяніла характар і тэмп сацыяльных працэсаў сярод беларускага сялянства, хаця яго ўдзельная вага сярод насельніцтва практычна не змянілася. Пасля адмены прыгоннага права сярод сялянства захаваўся падзел на шэраг катэгорый — былыя памешчыцкія, дзяржаўныя, удзельныя, дваравыя і інш., якія адрозніваліся паміж сабой па характару надзельнага землеўладання, умовах выкупу і памерах плацяжоў. Урадавая палітыка садзейнічала захаванню падзелу сялянства на розныя групы, які праіснаваў да пачатку XX ст. Па дадзеных 1858 г. у беларускіх губернях налічвалася 2 477 568 памешчыцкіх сялян, з іх 51 284 дваровых; 869 353 дзяржаўных і 24 373 удзельных [16, *272—273*]. Дзяржаўныя сяляне былі некалькі заможней былых памешчыцкіх, яны валодалі ў сярэднім большай колькасцю надзельнай зямлі. Прыкладна ў роўным маёмасным становішчы з былымі дзяржаўнымі знаходзіліся ўдзельныя сяляне.

Акрамя сялянства існавалі і іншыя нешматлікія групы сельскіх жыхароў — старабрадцы, чыншавікі, аднадворцы, вольныя людзі, праваслаўныя арандатары і інш. Стараабрадцы ўяўлялі сабой кансерватыўную групу, якая жыла адасоблена ад навакольнага вясковага насельніцтва. Гэтаму спрыялі іх этна-рэлігійныя адрозненні. Стараабрадцы пераважна негатыўна ўспрымалі праявы сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, падтрымлівалі ўрадавыя мерапрыемствы. Большасць стараабрадцаў было сканцэнтравана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У канцы XIX ст. іх тут налічвалася каля 125 тыс. чалавек.

Праваслаўныя арандатары былі сканцэнтраваны ў асноўным у Мінскай губерні. Яны былі нешматлікія па колькасці. У 1861 г. у Беларусі іх налічвалася каля 13,5 тыс. чалавек. Праваслаўныя арандатары былі землекарыстальнікамі і толькі ў 90-х гг. XIX ст. атрымалі магчымасць выкупляць арандаваныя імі землі.

У Беларусі канца XIX ст. налічвалася некалькі сотняў тысяч чыншавікоў. Яны бестэрмінова карысталіся зямлёй і абавязаны былі плаціць уладальніку зямлі грашовы аброк і выконваць шэраг павіннасцей адпаведна закону ці звычаю. Прадстаўнікі гэтай сацыяльнай групы маглі чыншавае права прадаваць, дарыць, перадаваць у спадчыну, закладваць. Адсутнасць заканадаўчых норм па іх землеўладкаванню дала памешчыкам нагоду для згону іх з зямлі пасля рэформы 1861 г. Толькі ў 1886 г. урад пацвердзіў права чыншавікоў на вечнае карыстанне зямлёй і даў ім магчымасць у трохгадовы тэрмін выкупіць зямлю.

У пачатку 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях налічвалася каля 100 тыс. «вольных людзей». Гэта былі нашчадкі вызваліўшыхся з-пад прыгону сялян. Асобную групу сельскіх жыхароў складалі аднадворцы — былая шляхта, не зацверджаная ў дваранскіх правах. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях аднадворцаў налічвалася каля 58 тыс. чал. Пасля паўстання 1863 г. колькасць іх павялічылася з-за паскарэння працэсу «разбора шляхты». У сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. толькі ў Мінскай губерні аднадворцаў налічвалася звыш 37 тыс. чалавек [18, *10*, *64*, *152*, *199*, *328*, *400*]. Столькі ж прыкладна іх было ў Магілёўскай губерні. Па сваіх бытавых умовах, эканамічнаму становішчу, памерах павінасцей аднадворцы не адрозніваліся ад асноўнай масы сялянства, аднак самаўсведамленне сваёй былой шляхецкай прыналежнасці перашкаджала іх знікненню сярод сельскага насельніцтва.

Трансфармацыя сялянства Беларусі ў 60—90-х гг. XIX ст. адбывалася пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў, эвалюцыі, буржуазных адносін. З імі звязаны сацыяльныя змены ў асяроддзі самога сялянства: паглыбленне маёмаснага расслаення, паскарэнне міграцыйных працэсаў сярод сельскіх жыхароў, з'яўленне новых рыс у менталітэце і г. д. Аднак гэтыя змены адбываліся нераўнамерна ў прасторы і часе. Больш заўважнымі яны сталі, пачынаючы з 80-х гг. XIX ст., 60—70-я гг. ніякіх істотных змен не прынеслі. На эвалюцыю сялянства значны ўплыў аказаў аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. Ён садзейнічаў сацыяльнай дыферэнцыяцыі вясковага насельніцтва і росту аграрнай буржуазіі. У рэгіянальных адносінах буржуазная трансфармацыя сялянства найменш інтэнсіўна адбывалася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе панавала сялянская абшчына і больш адсталай была сельская гаспадарка.

Стратыфікацыя сялянства айчыннымі гісторыкамі традыцыйна праводзілася на аснове групавання сялянскіх гаспадарак на падставе колькасці коней, якія належалі гаспадарцы, і велічыні выкарыстоўваемай ворнай зямлі. Крытэрыямі такога іерархічнага ранжыравання сялянства былі наступныя: уладальнікі гаспадарак без коней і з 1 канём адносіліся да ліку бедных; з 2 коньмі — да сярэдніх, з 3 і больш — да заможных; гаспадары з колькасцю ворыўнай зямлі да 4 дзесяцін — да бедных, звыш 8 дзесяцін — да заможных, астатнія да сераднякоў. На аснове праведзенага такім чынам групавання аказвалася, што на мяжы XIX—XX ст. бяднейшая група складала звыш 60 % сялянства, сярэдняя па заможнасці — каля 30 %, багацейшая — каля 8—10 %. Амаль палова прадстаўнікоў апошняй названай групы распараджалася зямельнымі ўладаннямі памерам звыш 100 гектараў і па велічыні гаспадарак уздымаліся да ўзроўню памешчыкаў. Аднак прыведзеныя крытэрыі і зробленая на іх аснове стратыфікацыя не бездакорныя.

13. Зак. 2457.

Пад ціскам нарастаючага к канцу XIX ст. беззямелля, вострай ва ўмовах Беларусі аграрнай перанаселенасці, сялянства вымушана было адыходзіць на промыслы, шукаць дадатковыя заробткі па-за межамі сваёй гаспадаркі, вёскі і г. д. Амаль палова сялян (адпаведна памерам аграрнай перанаселенасці) значную частку даходаў атрымлівала не праз сельскагаспадарчыя заняткі. У сувязі з гэтым больш аб'ектыўным з'яўляецца вызначэнне маёмаснай іерархіі сялянства праз улік агульнага даходу сялянскай гаспадаркі на душу насельніцтва. Але рэпрэзентатыўныя дадзеныя аб сукупных даходах вясковых жыхароў адсутнічаюць.

Сістэма сацыяльных каштоўнасцей беларускага сялянства да пачатку XX ст. захавала рэліктавыя формы прававых норм, старэатыпаў паводзін і ўяўленняў, якія не адпавядалі новым сацыяльна-эканамічным умовам. У паўсядзённым жыцці сялян шэраг функцый захавала сельская грамада, ва ўсходняй частцы Беларусі — абшчына. Ігнараванне меркаванняў грамады калектыўнай думкай успрымалася надзвычай адмоўна. Сяляне імкнуліся ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах грамады, паколькі яе рашэнні закраналі гаспадарчыя інтарэсы практычна кожнай сям'і. У вёсцы спалучаліся дзве структуры — афіцыйная і нефармальная. У афіцыйнай існавала іерархія кіраўнікоў: староста, пісар, зборшчык падаткаў і г. д. У нефармальнай структуры дзейнічалі неафіцыйныя лідэры, аўтарытэт якіх быў заснаваны на гаспадарчым стане і жыццёвым вопыце.

У параўнанні з саслоўнай іерархіяй больш рэальна змены, што адбыліся ў 60—90-х гг. XIX ст. у сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў, адлюстоўваюць перамены ў структуры яго заняткаў. Паводле перапісу 1897 г. сярод жыхароў Беларусі 8,15 % складалі асобы, занятыя ў прамысловасці (тут улічаны і прадпрымальнікі, і інжынерна-тэхнічныя работнікі, і рабочыя); 4,9 % — у сферы гандлю; 3,5 % — прыватнай службай, прыслуга, падзёншчыкі; 1,7 % — на транспарце і ў сувязі; 1,15 % — рантье; 1,15 % — ваеннаслужачыя; 0,6 % — чыноўнікі; 0,01 % — прадстаўнікі вольных прафесій (вучэбная, выхаваўчая дзейнасць, урачэбная і санітарная праца, работа ў сферы навукі, літаратуры і мастацтва, прыватная юрыдычная практыка); 0,05 % — пенсіянеры; 0,04 % — духавенства і 75,1 % — сельскагаспадарчае насельніцтва [9, вып. IV, V, XI, XXII, XXIII, табл. XXI]. Да канца XIX ст. у Беларусі склаўся дастаткова шматлікі слой людзей, якія былі заняты ў прамысловасці, гандлі, прыватнай службай і г. д.

Межы многіх сацыяльна-прафесійных груп былі дастаткова ўмоўныя, рухомыя. Адпаведна набыццю пэўнай адукацыі, змены сферы занятасці, чалавек на працягу свайго жыцця мог змяніць некалькі страт у сацыяльна-прафесійнай іерархіі. Аднак саслоўнае паходжанне да канца XIX ст. яшчэ ўплывала на фарміраванне асобных сацыяльных груп. Напрыклад, складванне чыноўніцкага апарату адбывалася двума шляхамі: па праву паходжання і па пэўнаму адукацыйнаму цэнзу. Па свайму сацыяльнаму паходжанню мелі права на дзяржаўную службу дзеці дваран, чыноўнікаў, купцоў першай гільдыі, святароў. Такое ж права мелі асобы, якія атрымалі вышэйшую ці сярэднюю (з адзнакай) адукацыю. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. былі зроблены выключэнні з правіл для асобных відаў дзяржаўнай службы: фінансы, тэлеграф і г. д. Акрамя таго, у сувязі з павелічэннем патрэб дзяржавы ў колькасці служачых, пашырэннем адміністрацыйнага апарату, развіццём транспарту, сродкаў сувязі і г. д. многія пасады пачалі замяшчацца па вольнаму найму. У беларускіх губернях не бралі на дзяржаўную службу яўрэяў і існавалі істотныя абмежаванні для католікаў.

Для стратыфікацыі чыноўніцтва асновай можа служыць яго размеркаванне адпаведна «Табелі аб рангах». З набыццём кожнага больш-менш высокага ранга (класа) звязвалася магчымасць атрымання дваранства, павелічэння жалавання, пасады і г. д. Хаця з цягам часу страчвалася адпаведнасць паміж класам чыноўніка і займаемай пасадай. У 1894 г. у губернскіх і павятовых адміністрацыях беларускіх губерняў налічвалася 3 чыноўнікі III класа (тайны саветнік), 27 — IV класа (сапраўдны стацкі саветнік), 61 — V класа (стацкі саветнік), 113 — VI класа (калежскі саветнік), 109 — VII класа (надводны саветнік), 64 — VIII класа (калежскі асэсар), 30 — IX класа (тытулярны саветнік), 18 — X класа (калежскі сакратар), 5 — XII класа (губернскі сакратар), 5 — XIV класа (калежскі рэгістратар) [1, *19—26, 55—60, 113—122*].

Развіццё прамысловасці і гандлю спрыяла фарміраванню значнага слоя прадпрымальнікаў. Колькасць буржуазіі павялічвалася за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, найперш дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, саслоўя пачэсных грамадзян, сялян і інш. Асноўная маса мануфактур і фабрык да канца XIX ст. належала дваранам. Гэта былі пераважна прадпрыемствы па прамысловай перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі з памешчыцкіх маёнткаў. Уладальнікамі дробных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках Беларусі з'яўляліся звычайна мяшчане, у большасці сваёй прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. За другую палову XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі вырасла з 28,2 тыс. у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. Сюды ўключаны гаспадары рамесных, дробнакапіталістычных і мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў, пры гэтым звыш 75 % складалі ўладальнікі першых з іх, і толькі каля 2,5 % (1897 чалавек) адносіліся да буйной і сярэдняй буржуазіі, уладальнікаў фабрык, заводаў, мануфактур. У 1890 г. сярод 343 уладальнікаў фабрык і заводаў Беларусі, улічаных афіцыйнымі статыстычнымі крыніцамі Расійскай імперыі, 169 (49,3 %) з'яўляліся дваранамі, 113 (32,9 %) — купцамі, 14 (4,1 %) — мяшчанамі, 5 (1,5 %) — сялянамі. З цягам часу паступова змяншалася доля дваран сярод уладальнікаў буйных і сярэдніх прадпрыемстваў.

Стратыфікацыя буржуазіі ў другой палове XIX ст. будавалася не толькі ўлічваючы велічыню капітала, а таксама і саслоўную і канфесійную прыналежнасць прадпрымальніка. Эканамічна больш магутнай была гандлёвая буржуазія, але пераважная частка яе была яўрэйская па этнічнай прыналежнасці і адпаведна з накірункам урадавай палітыкі мела абмежаванні ў правах, набыцці нерухомай маёмасці, вольным перамяшчэнні па тэрыторыі краіны.

Да часу правядзення рэформы 1861 г. у прамысловасці Беларусі налічвалася 41,5 тыс. наёмных работнікаў, у тым ліку 3,1 тыс. фабрычных і 4,7 тыс. мануфактурных. У 60—70-я гг. XIX ст. павелічэнне колькасці пралетарыяту ў Беларусі адбывалася адносна невысокімі тэмпамі. У далейшым, асабліва ў 1890-я гг., рост колькасці рабочых паскорыўся. У пачатку XX ст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых. На чыгунках колькасць рабочых дасягала 25 тыс. чалавек. Разам з іншымі галінамі народнай гаспадаркі агульная колькасць пастаянных наёмных работнікаў дасягала ў той час 460 тыс. чалавек. Папаўняўся пралетарыят пераважна з ліку сялянства, але з-за існаваўшай у той час рысы аседласці яўрэяў і адносна невялікіх магчымасцей гарадской прамысловасці сяляне не маглі знайсці працу на прадпрыемствах гарадоў і мястэчак Беларусі і шукалі работу ў сельскай і лясной гаспадарках, а таксама на транспарце і прамысловых прадпрыемствах, раз-

мешчаных у вёсках. Гарадскі пралетарыят на Беларусі найперш папаўняўся за кошт збяднелых мяшчан, рамеснікаў, гандляроў.

Увагай даследчыкаў абыдзена прадметнае вывучэнне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст., іх сутнасці і асаблівасцей. Пад іх уплывам адбывалася эвалюцыя сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства, аднак гэты працэс вызначаўся наяўнасцю шэрагу пераходных форм. У канцы XIX ст. склад насельніцтва Беларусі ўяўляў сабой складанае перапляценне саслоўных і сацыяльна-прафесійных груп жыхароў, што дадаткова ўскладнялася саслоўнай урадавай палітыкай і сістэмай абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні асобных катэгорый насельніцтва.

## ЛІТАРАТУРА

1. Адрес-календарь. Общая роспись начальствующих и прочих должностных лиц по всем управлениям в Российской империи на 1894 год: в 2 Ч. Спб., 1894.

2. *Дембовецкий А. С.* Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. В 3 кн. Могилев, 1882—1882.

3. *Корелин А. П.* Дворянство в пореформенной России: 1861—1904 гг.: Состав, численность, корпоративная организация. М., 1979.

4. *Миронов Б. Н.* Социальная история России периода империи (XVIII — начало XX в.). В 2 т. СПб., 1999.

5. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния: В 2 ч. / Сост. П. Бобровский. Спб., 1863.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

7. Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. Спб., 1868.

8. *Панютич В.* Помещечье землевладение в Белоруссии во второй половине XIX в.// Проблемы аграрной истории: В 2 ч. Ч. 2: XIX в. — 30-е годы XX в. Мн., 1978.

9. Первая всеобщая перепись населения Российской имерии 1897 г. / Под ред. Н. Тройницкого. Вып. IV. Виленская губерния. Тетради 1—3. Спб., 1900—1904; Вып. V. Витебская губерния. Тетради 1—3. Спб., 1899—1903; Вып. XI. Гродненская губерния; Спб., 1904. Вып. XXII. Минская губерния; Спб., 1904; Вып. XXIII. Могилёвская губерния. Спб., 1903.

10. Расійскі цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у С.-Пецярбургу, ф. 1263, воп. 1. спр. 3260.

11. РЦДГА ў С.-Пецярбургу, ф. 796, воп. 440, спр. 270.

12. Справка по вопросу о восстановлении собраний и выборов дворянства в девяти западных губерниях: В 3 ч. Б. м., б. г.

13. Список фабрик и заводов в России. Спб., 1903.

14. Статистика поземельной собственности и населенных мест Европейской России. Вып. 5: Губернии Литовской и Белорусской групп. LXIV. Спб., 1882.

15. Статистические сведения о церквях и причтах Минской епархии. Мн., 1880.

16. Статистические таблицы Российской империи. Вып. 2. Наличное население империи за 1858 год. Спб., 1863.

17. *Тальвирская З. Я.* К вопросу о социальном облике мелкого дворянства в 1860-х годах (по материалам трех уездов Минской губ.) // Историко-социологические исследования. М., 1970.

18. Труды Минского губернского статистического комитета. Мн., 1870. Вып. 1. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии.